Бібліятэка Бацькаўшчыны

Кніга 3

Натальля Гардзіенка

# Беларусы ў Аўстраліі

*Да гісторыі дыяспары*

Мінск
«Беларускі кнігазбор»
2004

УДК 94(=161.3)(94)
ББК 63.3 (8 Авс)
Г 20

*Сэрыя заснавана ў 2004 годзе*

Прадмова
Івонкі Сурвіллы

МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» выказвае шчырую падзяку
**Фэдэральнай Радзе Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі,**
**Беларускаму Цэнтральнаму Камітэту ў Вікторыі,**
**Беларускаму Рэзэрвоваму Фонду,**
**Беларускаму Аб'еднаньню ў Паўдзённай Аўстраліі,**
**Аўгену Грушу, Алегу Шнэку, Міхасю Лужынскаму,**
**Міколу Антуху, Гэнры Тэры, Галіне Падгайскай,**
**Віктару Ліпскаму, Аляксандру Бакуновічу,**
**Маргарыце Сямёнавай**
за чынны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі.

ISBN 985-6730-79-1

© Гардзіенка Н., 2004
© Сурвілла І., прадмова, 2004
© МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», 2004
© Афармленьне, МГА «Беларускі кнігазбор», 2004

Хаця на працягу апошніх шасьцідзесяці гадоў было апублікавана шмат кнігаў, прысьвечаных паасобным падзеям і людзям паваеннай хвалі беларускай эміграцыі, гісторык Янка Запруднік у адным з сваіх нядаўніх інтэрвію зазначыў, што «гісторыя беларускае паваеннае эміграцыі яшчэ не напісаная». Тыя з нас, хто перажыў паўстагодзьдзя ў выгнаньні, ведае, што застаецца яшчэ вельмі шмат не сказанага, не запісанага й належна не асэнсаванага. І таму атрымала я манускрыпт Натальлі Гардзіенкі, прысьвечаны беларускай дыяспары ў Аўстраліі, зь вялікім зацікаўленьнем.

Чытала я кнігу «Беларусы ў Аўстраліі» з захапленьнем і ўдзячнасьцю. Аўтарка ня толькі пасьпела запісаць шматлікія «жывыя мэмуары» нашых старэйшых суродзічаў, але й здолела цудоўна перадаць чытачу, чым яны жылі.

Пасьляваенная беларуская эміграцыя складаецца зь людзей — сярод якіх шмат інтэлігенцыі, — якія пацярпелі ад савецкай улады. Пакідаючы Бацькаўшчыну ў надзвычай цяжкіх умовах, адзінае, што яны везьлі з сабою, гэта сваю беларускасьць і сваю любоў да страчанага краю. Гэта й было тым скарбам, які стаўся падмуркам усяго, што беларуская дыяспара дасягнула за апошнія 60 гадоў.

Ад моманту, калі ўцекачы апынуліся на волі, яны пачалі арганізоўваць беларускае жыцьцё. Так як і ў кожным вольным грамадзтве, паўсталі розныя плыні, але ўсе мы мелі адну мэту: вярнуцца ў вольную й незалежную Беларусь.

У галіне палітыкі беларуская пасьляваенная эміграцыя ўважала найважнейшым сваім заданьнем стацца голасам у сьвеце паняволенага народу. Галоўнай мэтай кожнага з нас было сказаць сьвету, што Беларусь жыве, і што наш здольны й вольналюбівы народ, які абвесьціў незалежнасьць свае дзяржавы 25 Сакавіка 1918 году, працягвае змагацца за волю й незалежнасьць.

Пра ўсё гэта зь любоўю расказвае ў сваёй першай кнізе, прысьвечанай эміграцыі, гісторык Натальля Гардзіенка. Выбрала яна кантынэнт найбольш аддалены ад Беларусі і таму патэнцыяльна найбольш экзатычны. Зь зьдзіўленьнем аднак даведваемся, да якой ступені беларускае жыцьцё й думаньне ў гэтай далёкай краіне было падобнае да жыцьця беларусаў у іншых краінах сьвету.

Беларусы Аўстраліі бралі ўдзел у навуковых канфэрэнцыях, дэманстрацыях, выставах, канцэртах, фэстывалях, міжэтнічным грамадзкім жыцьці. Пісалі ў газэты, выдавалі кнігі. Як і ўсе мы, аўстралійскія беларусы выкарыстоўвалі кожную нагоду, каб інфармаваць сьвет пра існаваньне Беларусі, пра беларускую мову, культуру, гісторыю. Рабілі ўсё гэта пад знакам ПАГОНІ й нашым прыгожым бел-чырвона-белым сьцягам.

Між аўстралійскімі беларусамі адны былі больш актыўнымі, другія — менш. Гэта заканамернасьць жыцьця ўсіх дыяспараў, у тым ліку такіх, каму пашчасьціла абмінуць крыжовую дарогу пакутаў, якую з ласкі нашых суседзяў давялося прайсьці нам. Затое захапляюць вытрываласьць беларускіх дзеячоў у Аўстраліі й вернасьць нацыянальным ідэалам на працягу шасьцідзесяці гадоў нашай аўстралійскай дыяспары. Пра многіх яе прадстаўнікоў упершыню піша Натальля Гардзіенка.

Асабліва каштоўнымі былі для мяне ў кнізе ўспаміны беларускіх жанчын. Але праца Натальлі Гардзіенкі ўключае ўсе аспэкты беларускага жыцьця ў Аўстраліі: ад першых крокаў да набыцьця грамадзкай маёмасьці, ад сямейнага жыцьця — а хто пра яго мог лепей расказаць, як жанчыны й маткі, — да грамадзкай дзейнасьці, ад непаразуменьняў да памяркоўнасьці сямідзясятых і васьмідзясятых гадоў, калі людзі нарэшце зразумелі, што тое, што іх лучыць, куды важнейшае за тое, што іх дзеліць, і пачалі шукаць супольнай мовы.

Моцна шкадую, што Натальля Гардзіенка не адведала Аўстраліі раней, калі яна яшчэ застала б у жывых столькі ведамых за межамі Аўстраліі беларускіх дзеячоў. Хаця яна іх ня раз успамінае ў сваёй працы, прысутнасьць жывых галасоў Міколы Нікана, доктара Язэпа Малецкага, Аркадзя Качана й іншых, якія столькі зрабілі, каб беларушчына жыла ў Аўстраліі, ня толькі дапоўніла б, але мо й дазволіла б дакладней асэнсаваць некаторыя разьдзелы гісторыі беларусаў Аўстраліі.

Спадзяюся, што працу сваю аўтарка неадкладна прадоўжыць і ў іншых краінах, дзе спыніліся шляхі нашых суродзічаў. А тымчасам, Натальля Гардзіенка дадала надзвычай вартасны разьдзел да дыялёгу між дзьвюма неад'емнымі часткамі беларускага народу, той, якой пашчасьціла пражыць жыцьцё на зямлі сваіх продкаў, з аднаго боку, і дыяспарай — з другога.

Івонка СУРВІЛЛА.
*Старшыня Рады БНР*
*Атава, Канада, жнівень 2004 г.*